ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (794) ● Чацвер, 17 снежня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● **Нарада важакоў моладзі** ● Весткі з гістфака ● **Сесія стукае ў вокны** ● Рысы твайго сучасніка ● **На кафедрах і ў лабараторыях** ● У свеце паэзіі ● **Клопаты харыстаў** ● На спартыўных скрыжаваннях.

КАРЫСНЫ АБМЕН

З 7 па 12 снежня ў Мінску праходзіў семінар сакратароў маладзёжных арганізацый ВНУ сацыялістычных краін па пытаннях ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў. Сведчаннем вялікай увагі да праблем, вынесеных у павестку дня семінара, з'явіўся даволі высокі ўзровень прадстаўнічасці дэлегацый. Так, дэлегацыю узначаліў першы сакратар ЦК ЛКСМ В. Жыцянёў, старшыня Усепольскага камітэта супрацоўніцтва маладзёжных арганізацый, старшыня Галоўнага савета Саюза польскіх студэнтаў С. Чосак, старшыня студсавета пры ЦК ДКСМ Р. Гразкоў, сакратар ЦК ВКСМ П. Вайо, сакратар ЦК ССНМ В. Хергер, сакратар ЦК МРСМ Дашдаудон, член ЦК СТМ Хо Шы Міна Ву Конг Кан, першы сакратар пасольства Кубы ў СССР, член камісіі замежных спраў Нацыянальнага камітэта Саюза маладых камуністаў Кубы Д. Гусман, віцэ-прэзідэнт Саюза студэнцкіх асацыяцый СРР Г. Дока, сакратар ЦК ССМ Чэхаславакіі, старшыня Чэхаславацкага студэнцкага цэнтра Я. Прахазка. У рабоце семінара прынялі ўдзел сакратары камітэтаў камсамола буйнейшых ВНУ краіны, у тым ліку БДУ і БПІ.

З вялікай цікавасцю былі ўспрыняты даклады прарэктара нашага універсітэта С. А. Умрэйкі «Вучэбны працэс у вышэйшай школе і фарміраванне марксісцка-ленінскага светапогляду студэнцкай моладзі», першага сакратара ЦК ЛКСМБ У. Падрэза «Развіццё актыўных форм ідэалагічнай работы сярод студэнцтва» і шэраг іншых. Адбыўся карысны абмен вопытам работы паміж братнімі саюзамі моладзі сацыялістычных краін.

Карыснымі былі даклады Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС «Ленінская тэарэтычная спадчына і ідэйна-палітычнае выхаванне моладзі» і Інстытута эканомікі АН СССР «Умацаванне і развіццё сусветнай сістэмы сацыялізма».

9 снежня работа семінара праходзіла ў ВНУ Мінска. Гасцямі універсітэта былі прадстаўнікі моладзі Польшчы і ДРВ. Яны сустрэліся з рэктаратам і кіраўніцтвам парткома універсітэта, пазнаёміліся з арганізацыяй навучальнага працэсу, абмяняліся вопытам работы з камсамольскім актывам БДУ. Гэта сустрэча была вельмі цікавай і вылілася ў дэманстрацыю адзінства і салідарнасці сацыялістычных краін.

В. ПРАКОШЫН,
сакратар камітэта камсамола БДУ.

Засталося не так многа дзён да сесіі. Студэнты I курса геаграфічнага факультэта старанна рыхтуюцца да заняткаў, каб паспяхова здаць усе залікі і экзамены. Нярэдка яны звяртаюцца за дапамогай да старэйшых таварышаў, калі для іх што-небудзь незразумела.

На гэтым здымку вы бачыце студэнтку III курса Вольгу БАКШЭЕВУ (злева), якая дапамагае першакурснікам Б. СІДЭНКА, А. ЛАЎРОВАЙ і Н. КУДРАШОВАЙ падрыхтавацца да практычных заняткаў па геадэзіі.

Тэкст і фота студэнта А. НОВІКАВА.

ПА ПРАЦЫ І ВЫНІКІ

Хвалявaліся усе. Што ні гаварыце, ад пачатку сесіі залежыць настрой і на будучае.

Экзаменатар дацэнт У. А. Навіцкі улюбёны у свой прадмет. Ён гэту ўлюбёнасць перадае сваім выхаванцам. Як правіла, на яго лекцыях не бывае адсутных.

Заліковыя кніжкі адкрыты на чыстай старонцы. У графе «7 семестр» паяўляецца запіс «Геаграфія насельніцтва СССР».

Першыя чацвёра бяруць білеты. У аудыторыі наступае цішыня. Рыхтуюцца.

На лекцыі па гэтаму прадмету было адведзена 32 гадзіны. Практычныя заняткі у раскладзе не прастаулены, але для праверкі самастойнай работы студэнтаў па ініцыятыве кафедры былі праведзены два калёквіумы. У пяці групах IV курса адбыліся заняткі па арыенціроўцы на карце і па тэарэтычных праблемах. Вынікі абнадзеілі. Толькі ў другой групе вызначыліся 8 выдатнікаў: Е. Яфрэмкіна, І. Тарасевіч, Б. Курзо, В. Таран і іншыя. Аутсайдэраў амаль не было. Цяпер выдатнікі атрымаюць аўтаматычны залік.

І вось Е. Акачонак ужо гатова да адказу і падыходзіць да стала. Першае пытанне экзаменатара. «Славянскія народы СССР і іх месца знаходжання». Выразна і ясна гучыць адказ. Студэнтка асвятляе тэму шырока па ўсіх аспектах. Другое пытанне—«Працоўныя рэсурсы». І тут Ліза трымаецца упэўнена. Відавочна, што курс засвоіла вельмі добра, выдатна ведае карту.

— Хопіць. Усё зразумела. Калі б быў дыферанцыраваны залік, паставіў бы выдатна, — гаворыць У. А. Навіцкі.

Адзін за другім здаюць залік студэнты. Завалаў няма. Што ж, па працы і вынікі.

Л. МІТРАНОВІЧ.

АДЧУВАЦЬ ПУЛЬС ЖЫЦЦЯ

Кожнаму з нас, студэнтаў-журналістаў, вядома, якое значэнне для будучай работы мае глыбокае веданне ўнутранай і знешняй палітыкі нашай партыі, нашага ўрада. Адначасова з набыццём вядаў нам трэба пастаянна адчуваць пульс жыцця краіны. Дапамагаюць гэтаму лекцыі аб надзённых праблемах міжнароднага становішча, якія чытае ст. выкладчык А. В. Балаш.

Студэнты I групы IV курса штотыднёва, у перапынку паміж заняткамі, праводзяць палітінфармацыі. З цікавымі паведамленнямі выступалі Аня Александровіч, Люда Ванчукевіч, Надзя Дарашчук.

Карысную метадычную дапамогу ў падрыхтоўцы палітінфармацый нам аказвае куратар Аркадзь Іосіфавіч Наркевіч.

П. ГЕЙДЗІЧ.

ПОДЫХ СЕСІІ

Цяпер усе думкі студэнтаў-першакурснікаў журфака прыкаваны да сесіі. Яшчэ і яшчэ раз праглядае канспект па гісторыі КПСС Лена Халупава, а Саша Піталёў, Аня Фядотава доўга заседжваюцца над падручнікам беларускай сучаснай мовы. Цяжкавата ім: ні Саша, ні Аня да гэтага часу беларускай мовы не вывучалі. Цяжкавата даецца некаторым французская, англійская мова. А сесія ужо зусім блізка. Ідуць апошнія семінарскія заняткі.

...Да званка яшчэ добрых пяць мінут. Але уся трэцяя група ў зборы. Адзін другому задаюць пытанні, тлумачаць незразумелае. Тэмы семінарскіх заняткаў па гісторыі КПСС нялёгкія. Т. Я. Глушакова, выкладчыца гэтага прадмета, не стрымала усмешкі, калі убачыла пасля зададзенага пытання мноства рук. Адказваць гатоў кожны.

Упэўнена тлумачыць праграмныя патрабаванні партыі Лена Халупава. Яна выдзяляе асобныя месцы, зачытвае словы У. І. Леніна. Здаецца, усё сказана, і правільна, аднак Сяргей Цівanаў дапаўняе адказ. Свае думкі па гэтым пытанні выказваюць Таня Сенчык, Уладзімір Скульбедаў, Аня Фядотава.

Новае пытанне: «Крах II Інтэрнацыянала». І зноў адказваць хочуць усе. Першай гэтае права даецца Людзе Цімчанка, а пасля выступаюць Таня Тарлецкая, Георгій Чыгір і іншыя.

А вось калі Таццяна Яугеньеўна палрасіла расказаць аб войнах справядлівых і несправядлівых, па аудыторыі прайшоў лёгкі шэпт. Асмеліўся Саша Ступнікаў. Расказваў так, што і дапаўняць не было чаго.

Хутка праляцелі дзве гадзіны семінарскіх заняткаў. Я папрасіў выкладчыцу Т. Я. Глушакову выказаць сваю думку аб занятках.

— Вельмі прыемна, што студэнты ад заняткаў да заняткаў рыхтуюцца усё лепш, і галоўнае — смела і правільна дапаўняюць таварышаў. Павінна сказаць, што заняткі у 3 групе I курса праходзяць заўсёды цікава...

Але давайце пабываем яшчэ на занятках па французскай мове. Выкладчыца М. М. Краўцова праводзіць «размінку». Некалькі разоў запар паўтараюцца склады. Атрымліваецца не ва ўсіх. Прыходзіцца пачынаць усё спачатку... А цяпер можна пераходзіць да слоў...

Але самае галоўнае — тэма урока: трэба расказаць сваю біяграфію на французскай мове. Калі Тамара Субач, Люба Іванова, Тамара Анцуг, Таня Смірнова вывучалі у школе французскую мову, то астатнія у верасні толькі вымавілі першы французскі склад. І вось... Прыемна слухаць, як расказвае сваю біяграфію Валерый Яноўскі. Кожны склад, слова адшліфаваны. Нядрэнна атрымліваецца і у Люды Цімчанка і у іншых.

Плённа праходзяць семінарскія заняткі і па рускай і беларускай мовах, літаратуразнаўству. Подых сесіі адчуваецца, і, каб ён быў прыемным, студэнты вядуць барацьбу за веды.

І. СЦЯПУРА.

ГІСТФАК ЗА ТЫДЗЕНЬ

● На пасяджэнні партыйнага бюро факультэта зацверджана камісія па правядзенню Ленінскага заліку на чале з прафесарам Л. М. Шнеерсонам.

Зацверджан таксама мастацкі савет факультэта па падрыхтоўцы да універсітэцкага агляду мастацкай самадзейнасці. Узначальвае яго сакратар партбюро Э. М. Загарульскі.

● Выйшаў чарговы нумар насценгазеты «Гісторык». Прыцягвае увагу новая рубрыка, прысвечаная 50-годдзю універсітэта.

Камітэт камсамола публікуе матэрыялы па правядзенню Ленінскага заліку.

● На сходзе камсамольскага актыву адбылася вялікая размова аб культуры паводзін студэнтаў. З дакладам выступіў сакратар камсамольскага бюро факультэта Д. Ротман. Ён гаварыў аб спазненнях на лекцыі, прагульшчыках.

Аб падрыхтоўцы да Ленінскага заліку на факультэце расказаў намеснік сакратара камсамольскага бюро Анатоль Тозік.

● Умелы падбор рэпрадукцый карцін савецкіх мастакоў, змешчаных на стэндзе «Насустрач XXIV з'езду КПСС», дае яскравае ўяўленне аб гісторыі нашай Радзімы. Тут рэпрадукцыі карцін А. Дайнекі «Пакарыцелі космасу», «Першыя камунары» Г. Васецкага, «Даёш цяжкую індустрыю» Ю. Піменава, «Калгаснае свята» С. Гарасімава. Дэманструюцца таксама гістарычныя фатаграфіі перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага часу.

Гэты цікавы стэнд створан па ініцыятыве ст. выкладчыка кафедры гісторыі СССР А. А. Стуканава з выкарыстаннем рэпрадукцый карцін з яго асабістага збору.

● На чарговым пасяджэнні гуртка па гісторыі савецкага грамадства разгледжаны «Агульныя гістарычныя заканамернасці і нацыянальныя асаблівасці Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». З дакладамі выступілі кандыдат гістарычных навук В. Н. Сідарцоў і ст. выкладчык Л. А. Міхайлоўскі.

● Трэцякурснікі—частыя і жаданыя госці сваіх падшэфных — школьнікаў Засулцкай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна. У час мінулай паездкі яны арганізавалі «Агеньчык» дружбы і выступілі з канцэртам мастацкай самадзейнасці. Актыўны удзел у арганізацыі і правядзенні «Агеньчыка» прынялі студэнты III курса, члены агітбрыгады Люда Талмачова, Уладзімір Арлоў і Аляксандр Канеўскі.

● У аўторак адбылося сумеснае пасяджэнне аргкамітэта па правядзенню факультэцкай спартакіяды. Зацверджана палажэнне па правядзенню спартакіяды. У яе праграму ўваходзяць баскетбол, валейбол, настольны тэніс, лыжы, лёгкая атлетыка, шашкі і стральба з м/к вінтоукі.

Ва універсітэцкім цыры ужо пачаліся спаборніцтвы па стральбе, уступілі ў паядынкі шашысты і шахматысты.

● У мінулую суботу у актавай зале універсітэта праходзіў агляд мастацкай самадзейнасці усіх курсаў факультэта пад дэвізам «Мы таксама шукаем таленты». Мэта яго — стварэнне некалькіх моцных агітбрыгад і падрыхтоўка да агульнаўніверсітэцкага агляду мастацкай самадзейнасці.

● На мінулым тыдні прыступіў да рэпетыцый створаны упершыню на факультэце эстрадны аркестр.

М. ІНІН.

ТАВАРЫШ — ПРА ТАВАРЫША

У 1971 годзе наш універсітэт адзначыць сваё 50-годдзе. У сувязі з гэтым рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» запрашае чытачоў прыняць удзел у стварэнні галерэі партрэтаў лепшых прадстаўнікоў нашага калектыву пад дэвізам «Таварыш — пра таварыша».

Якія рысы паплечнікаў па рабоце і вучобе падкрэсліваць у партрэтных замалёўках, вам падкажа маральны кодэкс будаўніка камунізма, сфармуляваны у Праграме КПСС. Прынцыпы кодэкса, раскрываючы ў сканцэнтраваным выглядзе мараль камуністаў, ахопліваюць усе асноўныя віды маральных адносін паміж людзьмі: адносіны чалавека да грамадства, чалавека да чалавека, адносіны савецкіх людзей да сваёй сацыялістычнай Радзімы, да партыі, да іншых народаў. Змест кодэкса багаты і ёмісты. Ён уяўляе з сябе адно цэлае, бо ў аснове ўсіх прынцыпаў маральнага кодэкса ляжыць ленінскі крытэрый камуністычнай маральнасці —барацьба за камуністычнае грамадства.

Вось яны, дванаццаць прынцыпаў кодэкса:

— адданасць справе камунізма, любоў да сацыялістычнай Радзімы, да краін сацыялізма;

— добрасумленная праца на карысць грамадства: хто не працуе, той не есць;

— клопаты кожнага аб захаванні і памнажэнні грамадскага здабытку;

— высокае усведамленне грамадскага абавязку, нецярпімасць да парушэнняў грамадскіх інтарэсаў;

— калектывізм і таварыская узаемадапамога: кожны за ўсіх, усе за аднаго;

— гуманныя адносіны і узаемная павага паміж людзьмі: чалавек чалавеку—друг, таварыш і брат;

— сумленнасць і праўдзівасць, маральная чыстата, прастата і сціпласць у грамадскім і асабістым жыцці;

— узаемная павага у сям'і, клопаты аб выхаванні дзяцей;

— непрымірымасць да несправядлівасці, дармаедства, несумленнасці, кар'ерызму, хцівасці;

— дружба і брацтва усіх народаў СССР, нецярпімасць да нацыянальнай і расавай непрыязнасці;

— непрымірымасць да ворагаў камунізма, справы міру і свабоды народаў;

— брацкая салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін, з усімі народамі.

У РЭЧЫШЧЫ ЛЕНІНСКАГА ЗАЛІКУ

Цяпер у камсамольскіх арганізацыях праходзіць Ленінскі залік, прысвечаны XXIV з'езду партыі. Як жа праходзіць ён на гістарычным факультэце?

Першы этап заліку супаў з сельскагаспадарчымі работамі і павінен быў закончыцца камсамольскімі сходамі, прысвечанымі 50-годдзю прамовы У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола. Такія сходы у нас прайшлі. Але ў ходзе першага этапа былі дапушчаны і некаторыя памылкі: камітэт камсамола не змог давесці да ўсіх студэнтаў мэты і задачы Ленінскага заліку. Гэту работу прыйнлося перанесці на пачатак кастрычніка. Быў сабраны сход актывістаў, дзе абмяркоўваліся асноўныя напрамкі дзейнасці камсамольскай арганізацыі па правядзенню гэтай важнай кампаніі. Пасля прайшлі камсамольскія сходы ў групах, на якіх камсамольцы абмеркавалі абавязацельствы кожнага члена сваёй арганізацыі. Былі ўзяты і групавыя абавязацельствы. У іх вылучаны тры галоўныя напрамкі — вучоба, грамадская дзейнасць, навуковая праца. Кожны браў абавязацельствы адпаведна сваім здольнасцям і магчымасцям. І таму большасць з іх носіць дзелавы, канкрэтны характар. Напрыклад, у камсамольцаў першага курса (сакратар камсамольскага бюро М. Зыль), камсамольцаў III групы другога курса (камсорг І. Хітрун). Але многія—даволі агульныя, напісаны па шаблону (у камсамольцаў другога курса аддзялення палітэканоміі — камсорг А. Боеў, у І групе трэцяга курса — камсорг Л. Шляпнікава).

Набліжаецца канец першага семестра. Час падводзіць некаторыя вынікі. У бліжэйшыя дні мы намячаем у кожнай групе правесці сходы (у некаторых групах яны ўжо прайшлі), на якіх абмяркуем ход выканання ўзятых абавязацельстваў, разгледзім недахопы, намецім меры па іх ліквідацыі.

У нас створаны курсавыя і факультэцкая камісіі па правядзенню Ленінскага заліку. У іх састаў уваходзяць прадстаўнікі партбюро, камітэта камсамола, выкладчыкі. Камісіі павінны узначаліць усю работу па правядзенню Ленінскага заліку.

Ленінскі залік ні на адзін дзень не павінен выпадаць з поля зроку камітэта камсамола факультэта, камсамольскіх бюро курсаў, камсоргаў. Нельга думаць, што ён пачынаецца з прыняцця абавязацельстваў і заканчваецца падвядзеннем вынікаў у красавіку 1971 года. Уся дзейнасць камсамольскай арганізацыі павінна весціся у рэчышчы гэтага важнага мерапрыемства.

А. ТОЗІК,
намеснік сакратара камітэта камсамола гістфака.

ПРЫСВЕЧАНЫ ЯСЕНІНУ

Нядаўна у клубе геафака адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння С. А. Ясеніна. Аб жыцці і дзейнасці вялікага рускага паэта расказала дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры С. А. Лысенка. Прагучала многа ясенінскіх вершаў у выкананні студэнтаў і артыста тэатра імя Я. Купалы М. Р. Казініна. Былі выкананы песні на словы Ясеніна.

У заключэнне прысутныя прагледзелі фільм «Сяргей Ясенін». Арганізатарам вечара С. А. Лысенка і супрацоўніку бібліятэкі А. М. Рукшыну студэнты у знак удзячнасці падарылі кнігі.

А. СІЛІЧ.



НА ЗДЫМКУ: ідуць практычныя заняткі па вылічальных машынах і праграміраванню у студэнтаў II курса факультэта прыкладной матэматыкі. Вядзе іх Ірына Леанідаўна СЯРОВА.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ЭКЗАМЕНЫ ПРЫСПЕШВАЮЦЬ

Сесія набліжаецца. Кожны дзень вучобы цяпер вельмі напружаны для студэнтаў. Трэба рыхтавацца да залікаў, а таксама усю ўвагу звяртаць на апошнія лекцыпныя і практычныя часы, бо на іх як бы абагульняецца усё пройдзенае, растлумачваецца незразумелае і даюцца важкія парады для падрыхтоукі да экзаменаў.

Па заданню рэдакцыі я пабывала на філалагічным факультэце, пацікавілася, як тут праходзяць практычныя заняткі. Мікалай Дзмітравіч Міхей, выкладчык беларускай сучаснай мовы, прапанаваў пабываць у першай і другой групах III курса беларускага аддзялення.

Хоць гэта ужо амаль апошнія практычныя, але студэнты прыйшлі слаба падрыхтаванымі, дамашняе заданне не выканана... Матывавалася усё тым, што матэрыял вельмі цяжкі, незразумелы...

Прыйшлося выкладчыку прыступіць да поунага растлумачэння тэмы. Адзін за адным выходзілі студэнты да дошкі, запісвалі сказы, а сінтаксічны разбор праводзілі разам. Кожны выказваў свае меркаванні.

Наогул заняткі прайшлі цікава. Аказалася, што нічога такога незразумелага і цяжкага не было.

— Заняткі у асноуным праходзяць нядрэнна. Актыўна выступаюць студэнты Т. Мядзвецкая, А. Супрун, Л. Жандарэнка, Л. Андруш, В. Булыга, Т. Жук, В. Кабачэуская, С. Крываноc, М. Кавалёу, А. Цудня, — гаворыць Мікалай Дзмітравіч Міхей, — але бываюць і такія здарэнні, як сёння. Бяда ў тым, што некаторыя студэнты не вядуць канспектаў. Рыхтуюцца па падручніку, дзе матэрыял пададзен вельмі сціпла, а таму бывае, што якая-небудзь тэма і незразумелая. Я папярэджваю усіх, што рыхтавацца неабходна перш за усё па канспектах.

***

У зімовую сесію студэнтам IV курса філалагічнага факультэта трэба будзе здаваць экзамен па гісторыі беларускай літаратурнай мовы загадчыку кафедры беларускай мовы Л. М. Шакуну.

— Леў Міхайлавіч, раскажыце, калі ласка, як у вас праходзяць практычныя заняткі, як ідзе падрыхтоука да сесіі?

— Наведванне заняткаў вельмі добрае. Актыўна выступаюць студэнты Я. Шабановіч, М. Гулецкі, Л. Каспяровіч і інш. Студэнты пазнаёміліся з тэкстамі, напісанымі у розныя эпохі, разгледзелі старарускія помнікі. На занятках яны вызначалі, якімі сродкамі напісаны помнікі беларускай пісьменнасці, мастацкія творы, а таксама перакладныя помнікі і беларускія летапісы.

Усё гэта рабілася для таго, каб высветліць спецыфіку літаратурнай мовы, устанавіць, што адрозніваe яе ад сучаснай мовы.

Рыхтуюцца студэнты добрасумленна. Застаецца толькі пажадаць добрых поспехаў.

М. МАЦЕЙКА,
наш карэспандэнт.

На кафедрах і ў лабараторыях

У ПАЎСЯДЗЁННЫМ ПОШУКУ

Адной з лепшых на юрыдычным факультэце лічаць кафедру крымінальнага працэсу і крымналістыкі, якой загадвае дацэнт С. П. Бекешка. Гэта пацвярджае і знешні выгляд кабінета кафедры. Больш кветак, чым тут, няма нідзе. Упрыгожвае яе і вымпел пераможцы грамадскага агляду па культуры вытворчасці у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Калектыу кафедры імкнецца весці усе віды вучэбнай работы на высокім навуковым і метадычным узроўні. Многа увагі удзяляе кафедра кантролю за самастойнай работай студэнтаў. З гэтай мэтай практыкуюцца выклікі адстаючых на абавязковыя кансультацыі, кантрольныя работы, калёквіумы, індывідуальныя заданні. На працягу навучальнага года студэнты з цікавасцю удзельнічаюць у распрацоуцы навуковых праблем у кафедральных гуртках.

Будучым юрыстам трэба абавязкова валодаць фотасправай. Старшы выкладчык А. І. Кастроу расказвае аб тым, як арганізуюцца заняткі у фоталабараторыі.

— Раней мы займаліся у галоуным корпусе. Што і гаварыць, памяшканне, адведзенае пад фоталабараторыю, не давала магчымасці весці заняткі адпаведна плану. Цяпер у сувязі з пераездам у іншы корпус мы аказаліся у лепшым становішчы. У лабараторыі паставілі больш павелічальнікаў, лепш размясцілі фотаапаратуру.

— Якую сувязь мае фатаграфія з крыміналістыкай?

— Самую непасрэдную. Фатаграфія — адзін з метадаў крыміналістыкі, а зін з нав кова-тэхніч-ных сродкаў раскрыцця злачынстваў.

Каб паглыбіць веды студэнтаў, калектыу выкладчыкаў стараецца выкарыстоуваць разнастайныя формы работы. Так, у мінулым годзе цікава прайшла крыміналістычная віктарына паміж юрыдычным факультэтам, мінскім факультэтам вышэйшай школы МУС СССР і мінскай спецыяльнай сярэдняй школай міліцыі імя М. В. Фрунзе МУС СССР. Пераможцам у ёй аказаўся юрыдычны факультэт. Многа давялося папрацаваць арганізатар гэтай віктарыны кандыдату юрыдычных навук ст. выкладчыку І. А. Матусевіч. Цяпер Ірына Антонаўна займаецца падрыхтоукай наглядных вучэбных дапаможнікаў, робіць стэнд для заняткаў па крыміналістыцы.

Члены кафедры прымаюць удзел у палітыка-выхаваучай рабоце. В. а. прафесара І. І. Марціновіч і І. А. Матусевіч з'яуляюцца куратарамі груп.

На кафедры вядзецца і вялікая навукова-даследчая работа. Распрацоуваюцца тэарэтычныя пытанні крымінальна-працэсуальнага права, форм і сродкаў забеспячэння непазбежнасці справядлівага пакарання за злачынства у СССР. Акрамя работы над планавымі тэмамі, супрацоунікі кафедры рэцэнзіруюць кандыдацкія і доктарскія ысерта ы, удзельнічаюць у абмеркаванні праектаў законаў БССР. Многія выкладчыкі працуюць ва універсітэце прававых ведаў, чытаюць лекцыі па судаводству, выступаюць па радыё, тэлебачанню, прымаюць удзел у абмеркаванні судовай практыкі у пракуратуры.

У гэтым годзе выйшаў з друку зборнік «Пытанні судовай псіхалогіі». Вялікі удзел у яго выпуску прыняў прафесар А. В. Дулаў. Ён аутар яшчэ дзвюх манаграфій: «Судовая псіхалогія» і «Уводзіны у судовую псіхалогію». Дацэнтам В. М. Шпілевым выдадзена манаграфія «Удзельнікі крымінальнага працэсу». Шэраг артыкулаў супрацоунікаў кафедры надрукаван у навуковых часопісах і зборніках.

Л. КАЛЮЖНАЯ.

СЛОВА ПРА АЛЬМАНАХ

Перада мною чарговы нумар альманаха «Творчасць журналіста», які з'яўляецца органам студэнцкага навуковага таварыства факультэта журналістыкі. Прысвечаны ён 100-годдзю з дня нараджэння заснавальніка нашай дзяржавы — У. І. Леніна, і тэта наклала пэуны адбітак на матэрыялы, змешчаныя у ім. Жанры самыя разнастайныя: гэта і публіцыстычны артыкул, і рэцэнзія, і верш, і апавяданне. Не усе творы дасканалыя, але ёсць у іх дапытлівы пошук, ёсць неадольнае жаданне сказаць нешта сваё, асабістае пра Леніна і, праламляючы яго ідэі праз трызму уласнага светапогляду, паказаць, як жывуць і развіваюцца яны у свядомасці кожнага з нас.

Па-першае, трэба сказаць некалькі слоу аб навуковых дакладах «Луначарский о Ленине» А. Красінскай, «Образное слово в публицистике В. И. Ленина» Э. Мельнікава, а таксама «Ленинская эстафета на Белорусском телевидении» Т. Ражковай. Напісаны яны няблага — нават болей, добра — і даюць падставы меркаваць, што далейшае паглыбленне аутарамі ведаў у той галіне навукі, якую яны выбралі, дазволіць ім напісаць яшчэ больш змястоуныя працы. Гэтыя даклады пакідаюць добрае уражанне, але нельга не сказаць і пра асобныя хібы.

На маю думку, залішняя расцягненасць, пауторы, пераход з асноунай тэмы на пабочную збіваюць думку чытача і прыводзяць да неразумення у ацэнцы таго ці іншага факта пазіцыі аутара.

Занадта доугай атрымалася і рэцэнзія Я. Халява «Все касается всех». Тое, што размясцілася на васьмі старонках, лепш укладася б на чатырох. Тады б рэцэнзія мела больш цэласны характар.

Што датычыцца вершаў, сабраных у альманаху, то знаёмства з некаторымі вельмі радуе.

Добрыя радкі ёсць у Л. Анопа. Паэтычнае бачанне свету, якое ярка і вобразна выявілася у вершы пра аленяу, што носяць восень на цёплых спінах, дазваляе меркаваць аб наяунасці у аутара пэунага таленту. Прауда, другі верш, змешчаны тут жа,— надзвычай недасканалы. І думка ў ім добрая — а верша няма.

Добрае уражанне пакідаюць верш В. Аучарэнкі «Слушайте Ленина...», эцюд Р. Гусевай «Березка я!..», вершы Г. Пашкова «Цецерукамі маразы...», В. Шырко «Не частуй саладжавай гарбатай...». А увогуле у альманаху трапляюцца такія слабыя вершы, што дзіву даешся, як яны трапілі на старонкі рэцэнзуемага выдання. Не удауся В. Дранчуку верш «У. І. Ленину». Перапеу тут яуны, а параўнанне галавы, сэрца, мозга з яблыкам — прамое перайманне з творау Э. Межэлайціса «Человек», «Частица матери-земли», «Сердце» і некаторых іншых.

Літаратуршчына, слоўная эквілібрыстыка уласцівы творам В. Трусава. Чаго варты такія, скажам, радкі:

Омою потное лицо
В божественной купели.

Альбо:

Навалом листья, тучи мух..
Цветы, кусты и небо.
И, словно призрак бытия,
По рыжему откосу
Скользит довольная змея
И дразнится раскосо.

Я асабіста сутыкнууся неяк у лесе са змяёй і, шчыра прызнацца, не раздзяляю думкі В. Трусава аб тым, што змяя можа «дразниться», а тым больш «раскосо».

У ненкай меры тым жа грашаць вершы В. Мухіна. Першы твор, прысвечаны школьнаму дырэктару, — няудалы, а другі — своеасаблівая інтэрпрэтацыя А. Вазнясенскага.

Нейкая раскіданасць, незавершанасць і, можа нават, залішняя лёгкасць адчуваецца у вершах Н. Лось. Чаму аудыторыя «пузатая», чаму лета «тоненькае»? Недакладна.

У лірыцы А. Трызны адчуваюцца песімістычныя матывы. Такі яго першы верш, дзе ёсць радкі:

Ты радиатором в барьер,
Как извержение Везувия,
И жизнь твоя —
Обломков груда...

І, наогул, калі верыць А. Трызне, дык над яго героем—слава «черным вороном», і «вызывают «неотложную твоей жене, рыдая, близкие». А у другім вершы «небо давит своим весом, взвалив на плечи тяжкий крест». І у заключэнне А. Трызна усклікае (!): «А как нелепо быть поэтом...»

На фоне празаічных мастацкіх твораў выдзяляецца апавяданне З. Дабрынеускага «Дзедавы бэры», хоць і яно не пазбаўлена агрэхаў.

І, нарэшце, апошнія два матэрыялы, змешчаныя ў альманаху, — рэцэнзія В. Добкіна на спектакль «Прауду! Нічога, акрамя прауды!» і І. Асінскага на раман Ул. Карпава «Сотая маладосць». Трэба адзначыць, што напісаны яны з душою, не вельмі расцягненыя і таму чытаюцца з інтарэсам.

Хочацца пажадаць, каб чарговы нумар альманаха быў лепшы за папярэднія.

В. ШЫХАНЦОЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

ТВОЙ РОДНЫ ДОМ

Падыходзіць да канца 1970 год. Пара азірнуцца назад і паглядзець, што зроблена па выкананню плана мерапрыемстваў па далейшаму паляпшэнню жыллёва-бытавых умоу, медыцынскага абслугоўвання і грамадскага харчавання студэнтаў.

Наш карэспандэнт **А. Міхальчанка** сустрэуся са старшынёй прафкома М. Драздом, камендантам інтэрната № 4. Г. М. Рабцэвічам і некаторымі іншымі супрацоунікамі і папрасіу адказаць на наступныя пытанні:

— Як выканан план?

— У чым вы бачыце недахопы?

— Што мяркуецца на будучае?

У цэлым план выканан. Расшырылі сталовую да 60 месц. Ёсць буфеты у вучэбных карпусах. Адрамантаваны інтэрнаты. Больш стала мэблі, пасцельных рэчаў.

Добрыя вынікі прынёс месячнік па упарадкаванню інтэрнатаў.

Адпаведна плану значна палепшыцца і медыцынскае абслугоўванне. Ужо цяпер дадатковыя памяшканні атрымаў здраўпункт. А з новага года тут будзе аддзяленне паліклінікі.

Зроблена, як відаць, нямала. Аднак ёсць яшчэ і шмат недахопаў. Не кожны пакой быту абсталяван як трэба. У інтэрнатах №№ 4 і 5 да гэтай пары не падведзен газ.

Камендантыя не выкарыстоўваюць належным чынам машыны для мыцця бялізны. Баяцца, што студэнты іх сапсуюць. І машыны ржавеюць на складах.

Не усё наладжана з прапускной сістэмай.

У інтэрнаце № 4 не хапае 400 крэслаў і 100 сталоў. Гэта у нейкай меры вынік таго, што студэнты часам дрэнна ставяцца да захавання дзяржаўнай маёмасці, з-за чаго многія рэчы не дажываюць свайго часу эксплуатацыі. Што рабіць для таго, каб універсітэт стаў родным домам для студэнтаў? Зараз распрацоуваецца новае палажэнне конкурсу на лепшы інтэрнат, пакой, паверх, прафарганізацыю факультэта. Пераможцы атрымаюць грашовыя прэміі, бясплатныя пуцёукі у дамы адпачынку. Намечан яшчэ шэраг захадаў па паляпшэнню умоу вучобы і быту студэнтаў.

ЧАМУ ЛЕПШЫЯ НЕ МЫ?

Роздум пасля конкурсу

Напэуна, амаль кожнаму студэнту БДУ вядомы універсітэцкі ансамбль «Спін», яго праграма, імёны і прозвішчы членаў ансамбля, але у той жа час, мяркуючы па адказах, многія студэнты не ведаюць, што сабой уяўляе харавая капэла універсітэта, якой у гэтым годзе споўнілася 25 год. Часам крыудна слухаць мне і членам нашага калектыву словы: «А, дык гэта капэла!?..», якія вымауляюцца з пагардай.

Няхай вялікай папулярнасці харавых спеваў у Беларусі няма, як у рэспубліках Прыбалтыкі, але харавое мастацтва трэба цаніць як адно з самых цяжкіх па свайму выкананню і адно з самых цудоуных па гучанню, каларыту, па насычанасці фарбамі і адценнямі.

Зусім нядауна наш калектыу пабываў у Каунасе на конкурсе «Юнацтва-70», які быу прысвечан 20-годдзю Каунаскага політэхнічнага інстытута. Гэта не першы конкурс такога роду. У 1968 годзе конкурс «Юнацтва-68» прысвячаўся 50-годдзю Ленінскага камсамола (наша капэла тады не удзельнічала). У тым жа 1968 годзе у ліпені праходзіла свята песні «Гаудэамус», на якое з'ехаліся з усіх канцоу краіны харавыя калектывы і танцавальныя ансамблі. Старэйшыя удзельнікі капэлы добра памятаюць аб гэтых днях песні, сонца, дружбы.

Цяперашні конкурс «Юнацтва-70» хоць і не меў такога маштабу (на ім было усяго 6 калектываў), але етау цудоуным святам песні шасці саюзных рэспублік: Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, РСФСР, Украіны. Наш калектыу прадстаўляў БССР.

Латвія была прадстаўлена заслужаным калектывам Латвійскай ССР акадэмічным хорам Каунаскага політэхнічнага інстытута «Яуністэ», заняушым трэцяе месца, Літва — узорным калектывам Літоўскай ССР акадэмічным хорам «Габія» Вільнюскага інжынерна-будаўнічага інстытута (які выступау па-за конкурсам), РСФСР — народным калектывам РСФСР хорам студэнтаў Ленінградскага тэхналагічнага інстытута імя Ленсавета (першае месца), Украіна — народнай капэлай УССР Кіеускага політэхнічнага інстытута, Эстонія — талінскім студэнцкім змешаным хорам (другое месца).

Наша капэла не заняла прызавога месца, але мы прывезлі з сабой тры узнагароды: медаль лаурэата атрымаў наш саліст Я. Сафонау за выкананне песні «Однозвучно гремит колокольчик», прызам было адзначана выкананне конкурснай песні І. Лучанка «Ён радзіуся вясной», спецыяльны прыз атрымау сам І. Лучанок за стварэнне гэтай песні. Гэты прыз мы уручылі кампазітару на сходзе капэлы адразу пасля вяртання з Каунаса.

Я быу упершыню у такой адказнай паездцы, таму, можа, яна аказала на мяне вялікае уражанне. Я пераканауся, што Прыбалтыка — гэта рэспублікі песні, у якіх харавое выкананне стаіць на вельмі высокім узроуні. Аб гэтым нават гавораць тыя гастрольныя паездкі, якія робіць ужо вядомы нам «Яуністэ». Польшча, Чэхаславакія, Балгарыя, Югаславія — гэта не поуны пералік краін, дзе пабываў хор з канцэртамі.

Я гутарыу з многімі удзельнікамі калектыву, цікавіуся іх метадам работы. Аказалася, што і яны не спяваюць цэлымі суткамі, маюць такія ж умовы, як і мы. Дык чаму ж мы спяваем горш? Па-мойму, мала увагі удзяляецца харавым спевам і у нашым універсітэце, і увогуле у рэспубліцы. Вельмі здзівіліся рабяты з іншых калектываў, што у нашай капэле з году у год мяняецца састау амаль напалову, як, напрыклад, у гэтым годзе. У хорах «Яуністэ», ленінградскім спяваюць выкладчыкі, аспіранты, былыя студэнты, якія працуюць цяпер у гэтым горадзе. Ім нават даюцца льготы пры размеркаванні.

Харавыя спевы — гэта важкая праца, глыбокія веды і навыкі, якія нельга атрымаць за паутара-два гады, яны прыходзяць значна пазней. І таму стабільнасць калектыву—важная умова таго, што гэтыя хоры спяваюць лепш за наш.

А хто з нашых выкладчыкаў і супрацоунікаў сур'ёзна адносіцца да харавых спеваў? Нямногія. Аб гэтым красамоўна гаворыць састаў капэлы: сярод яе членаў няма ніводнага выкладчыка і адзін, усяго адзін, супрацоунік, у той час як у хоры «Яуністэ» больш паловы удзельнікаў — гэта выкладчыкі і былыя студэнты.

Вельмі мала увагі удзяляецца прапагандзе харавых спеваў у друку. А што зрабілі у гэтым напрамку камітэты камсамола факультэтаў і універсітэта? Калі неабходна праслухаць першакурснікаў, то старасце, кіраўніку даводзіцца хадзіць і упрашваць студэнтаў прыйсці на праслухоуванне. А, напрыклад, у «Яуністэ» больш складана трапіць, чым паступіць у інстытут. У іх існуе нават падрыхтоучая група, у якой здольныя студэнты праходзяць выпрабавальны тэрмін, вучацца культуры спеваў, выканаучаму майстэрству.

Многія удзельнікі конкурсу пыталі: «А што, вы — лепшы калектыу рэспублікі?». І, прауду кажучы, мне было цяжка што-небудзь адказаць. Мне здаецца, што неабходна правесці рэспубліканскі агляд маладзёжных харавых калектываў, на якім сапрауды выявіць лепшы хор рэспублікі і ужо яго пасылаць на такога роду конкурсы, як гэта робіцца у рэспубліках Прыбалтыкі.

А калі ужо мы прэтэндуем на званне лепшага калектыву, то патрэбна, каб рэспубліка ведала пра нас па нашых выступленнях, канцэртах. Звярніце ўвагу на такі факт: за увесь 1968-69 навучальны год наш калектыу быу толькі у дзвюх паездках па Беларусі — у Гомелі і у адной з часцей БВА. Гэтага надзвычай мала, вельмі мала.

У 1971 годзе адзначаецца 50-годдзе БДУ. Дык чаму б і нам не правесці, як гэта зрабіу політэхнічны інстытут Каунаса, сваё свята песні, запрасіць у Мінск калектывы з Ленінграда, Масквы, Кіева і іншых гарадоў нашай краіны.

Мне здаецца, што гэтае пытанне сур'ёзна паўстае на павестку дня і станоўчае яго рашэнне падыме прэстыж харавых спеваў.

А. НОВІКАЎ,
староста капэлы, студэнт II курса факультэта прыкладной матэматыкі.

Студэнцкі дзень напярэдадні сесіі, здаецца, можа умясціць два звычайныя дні. Трэба праслухаць лекцыі, а іх бывае і тры, і чатыры, падрыхтавацца да практычных або семінарскіх, у перапынку здаць залік, а пасля яшчэ паспець на спартыуныя трэніроўкі або на рэпетыцыю мастацкай самадзейнасці. Несумненна, што і у гэтых студэнтаў II курса фізфака, якія слухаюць лекцыю выкладчыка В. Я. Гракава, сёння нямала спраў.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМ

ДОБРАЙ традыцыяй сталі сустрэчы студэнтаў нашага універсітэта з беларускімі пісьменнікамі. Адна з такіх сустрэч адбылася нядаўна на філалагічным факультэце. У госці да першакурснікаў беларускага аддзялення прыйшоў паэт Мікола Аурамчык. Ён падрабязна расказаў, як ствараліся вершы ваеннага цыклу, якія пачуцці хвалявалі у той час паэта.

У саставе пісьменніцкіх дэлегацый Мікола Аурамчык аб'ездзіў не толькі усю Беларусь, але і многія гарады і мясціны нашай неабсяжнай Радзімы. Пра некаторыя з гэтых паездак, пра цікавыя сустрэчы з пісьменнікамі розных Савецкіх рэспублік таксама ішла гутарка са студэнтамі.

Вельмі многа уражанняў пакінула наведанне ленінскіх мясцін, дзе ён быў з такімі вядомымі празаікамі і паэтамі, як Д. Гранін, Л. Касіль, Б. Акуджава, С. Капуцян, і інш.

Незабыўным было усесаюзнае пушкінскае свята паэзіі, дзе, дарэчы, І. Андронікаў пазнаёміў М. Аурамчыка з праўнукам А. С. Пушкіна Рыгорам Рыгоравічам. На гэтым свяце М. Аурамчык чытаў «Балладу аб вызваленым паэце», напісаную неўзабаве пасля вайны. Студэнты даведаліся аб гісторыі стварэння гэтага твора. Паэт расказаў студэнтам пра многіх вядомых савецкіх пісьменнікаў, такіх, як І. Андронікаў, Ю. Друніна, П. Панчанка, А. Коршак, і многіх іншых.

Потым М. Аурамчык прачытаў некалькі вершаў з новай кніжкі «Як на далоні», якая выходзіць у бібліятэчцы «Вожыка», з тонкім гумарам расказваў асобныя моманты са свайго студэнцкага жыцця.

У заключэнне сустрэчы студэнты уручылі паэту кветкі, а ён, у сваю чаргу, падпісаў ім сваю кніжку вершаў «Агледзіны».

Сустрэча прайшла вельмі цікава, і пажадана, каб адбывалася такія карысныя для студэнтаў гутаркі як мага часцей.

В. КАРПОВІЧ.

СВЯТА МАЛАДОЙ ПАЭЗІІ

КАМСАМОЛ надае у наш час вялікае значэнне рабоце з маладымі літаратарамі, прапагандуе усё лепшае, што ствараецца творчай моладдзю ва усіх рэспубліках нашай многанацыянальнай Радзімы. На гэта ж накіраваны усесаюзныя, занальныя нарады і семінары, праца творчых груп і брыгад, правядзенне тыдня маладзёжнай кнігі і г. д.

Значнай падзеяй у літаратурным жыцці краіны сталі штогадовыя фестывалі маладых паэтаў братніх рэспублік. Гаспадарамі такіх фестываляў ужо былі Малдавія, двойчы — Украіна і Казахстан. У гэтым, ленінскім годзе, ён прыйшоў на зямлю Расіі, да берагоў вялікай Волгі.

Волга... Яна дала свету аднаго з геніяльных людзей — М. Горкага. Убачыўшы гэтую магутную раку, міжволі ўспамінаюцца радкі Някрасава: «О, Волга! Колыбель моя, любил ли кто тебя, как я?!»

І сапраўды, нельга не палюбіць гэтыя гулкія воды, гэтыя пейзажы, што упрыгожваюць яе берагі. І каб па-сапраўднаму адчуць творчасць М. Горкага (мне так здаецца), трэба абавязкова пабываць на Волзе, бо рака усё тая ж — то спакойная, то бурлівая, бо не перавялося яшчэ і волжскія рыбакі і яркія кастры на берагах яе, бо жывуць каля Волгі людзі з шырокай і адкрытай душою.

Не, напэўна нездарма сюды прыехалі сорак пяць паэтаў з усіх братніх рэспублік, маладыя паэты з некаторых аўтаномных рэспублік Паволжа, літаратары з Масквы, Ленінграда, Саратава.

Сустрэчы, знаёмства з творчаюцю дэлегатаў гэтага фестывалю парадавалі тым, што рэспублікі рэкамендавалі на Усесаюзны форум дастойных паэтаў. Нягледзячы на тое, што узрост удзельнікаў быў строга абмежаваны 28-мю гадамі, многія ужо з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў СССР, аўтарамі некалькіх паэтычных зборнікаў, актыўна удзельнічаюць у грамадскім жыцці рэспублік.

Так, дваццаціпяцігадовы таджык, камсамолец Хабібуло Файзуло — член Саюза пісьменнікаў СССР — пераклаў на сваю родную мову вершы М. Лермантава, А. Блока, Д. Кедрына, М. Танка. Латышскі паэт Арманд Мелналканіс — аўтар тэкстаў папулярных у рэспублцы песень. Пасланцы Грузіі Вано Цхіквадзе і Тэдо Бекішвілі — члены літаратурнай секцыі эстэтычнай камісіі пры ЦК ЛКСМ Грузіі.

З многімі паэтамі я сустракалася яшчэ раней, у Маскве, на V Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў. Гэта Альфонсас Бунонтас (Літва), Акуштап Бактыгерэева (Казахстан), Томас Вінт (Эстонія), Хабібуло Файзуло (Таджыкістан). Спіс гэты можна было б і прадоўжыць, але гаворкі і спрэчкі, што вяліся на паэтычных семінарах, напэўна маглі б сказаць яшчэ больш, чым самі імёны.

У творчых семінарах Міхаіла Львова, Уладзіміра Сакалова, Валянціна Сарокіна і Вадзіма Кузняцова было надзвычай ажыўлена і цікава. Разглядалися не толькі творы аўтараў, але закраналіся праблемныя пытанні на шляху у сапраўдную паэзію. Радавала тое, што хоць вершы гучалі на розных мовах і прыблізны змест перадавалі толькі падрадкоўнікі, але гучэла ва усёй паэзіі маіх сяброў высокае слова прауды жыцця, зварот да музычнасці радка і да філасофскай паглыбленасці зместу.

«Не падганяй час, інакш ён будзе слухаць цябе, як дрэннага настаўніка», — сказаў мне Арманд Мелналканіс. Мы доўга спрачаліся тады усе, але прыйшлі да аднаго — нельга імкнуцца «ахапіць неабдымнае» толькі неякімі філасофскімі выдумкамі, гульнёю слоў і складу верша. Мы зразумелі яшчэ і тое, што калі пісаць, то толькі пра сваё — інакш не можа быць у нас свайго прозвішча!

Сапраўды, наступіў такі час у паэзіі, калі уся наша паэтычная эпоха як бы павярнула да прастаты. У якім жа сэнсе? Вядома — гэта гарманічнае успрыйманне пачуцця, музыкі і думкі. У гэтым сэнсе мяне абрадавала паэзія Віктара Чарэдніченкі (Украіна), Альфонсаса Бунонтаса (Літва), Людмілы Калінінай (РСФСР) і многіх іншых паэтаў.

Акрамя творчых семінараў і выступленняў, у нас былі цікавыя падарожжы ў Сямёнава, Балахну, Арзамас і Пушкінскае Болдзіна.

Відаць, мне пашчасціла, бо я трапіла ў тую групу, якая накіроувалася у Сямёнаў і ў Болдзіна.

Яшчэ да паездкі ў Сямёнаў, што стаіць на старажытнай рацэ Кержанец, я ведала, што гэты горад сярод лясоў і лугоў — радзіма выдатнага савецкага паэта Барыса Карнілава. На памяць неадчэпна прыходзілі яго радкі:

Усталость тихая,
вечерняя
Зовет из гула голосов—
В Нижегородскую
губернию
И в синь семёновских
лесов.

Пявучыя радкі вялі да такіх жа пявучых майстроў — хахломскіх мастакоў. Напэўна, ва усім свеце вядомы іх прыгожа распісаныя драўляныя лыжкі і куфлі, міскі і цэлыя сталовыя наборы.

Пазней мы сустрэліся з маці Карнілава — Таісай Мікалаеўнай Карнілавай. Ёй ужо 79 год. Згублен зрок, пагоршан стан здароўя, але заўсёды цёплажурлівым стае мацярынскае аблічча, калі ўспамінаюць яе Барыса, калі гаворка ідзе пра яго творчасць, пра суровы паэтычны шлях. Да гэтага часу яна не верыць, што яго няма. Здзівіла нас і тое, што Таіса Мікалаеўна ведае амаль усе вершы Барыса напамяць. На развітанне яна падарыла нам яго дапоўнены паэтычны томік і фотакарткі. Кожны пасля гэтай сустрэчы як бы пабагацеў душою, пабагацеў на веру ў жыццё, на светлыя радкі паэзіі Барыса Карнілава.

Назаўтра наш шлях ляжаў у Пушкінскае Болдзіна. Вось куды мяне цягнула настойлівa і даўно! Якраз па дарозе загрымеў гром, потым палiў густы і зацяжны дождж. І мы сапраўды адчулі болдзінскую восень, пра якую пісаў Пушкін у сваіх пісьмах.

Было дзіўна і хораша ў прыродзе, асабліва у Пушкінскім садзе ля сажалак. Прайшло многа часу, але падрадкоўнікі захаваліся, а масты рэстаўрыравалі самі болдзінцы.

Кранула і тое, што болдзінцы любяць і паважаюць народную песню і народны танец, заусёды з вялікім задавальненнем выступаюць перад гасцямі. На гэты раз яны таксама кінулі сваіх унукаў, кінулі працу на гаспадарцы і прыйшлі у дом Пушкіна, каб расказаць нам пра свой край, пра Пушкіна. І вось адна за адной паліліся песні. Болдзінцы з трапяткім пачуццём выканалі і любімую песню Пушкіна «Во садочке, во саду ли», якую ён сам яшчэ некалі запісаў у свой фальклорны сшытак. Колішняя багатая вопратка — шарсцяныя малінавыя, жоўтыя, ружовыя, зялёныя касцюмы расіянак 60-х год бясконца гарманіравалі з іх цудоўнымі песнямі і галасамі. Прагучалі і частушкі пра Пушкіна, складзеныя мясцовай жыхаркай Варварай Шумілінай.

Потым быў ад'езд праз Арзамас, праз беланогія бярозавыя лясы, праз духмяныя лугі болдзінскага навакольля. Многія з нас везлі у сабе і мелодыю, і слова, і кароткія паэтычныя запісы, каб потым выліць усё гэта у адно цэлае—у паэзію.

Восем дзён на зямлі Горкага, на волжскіх прасторах праходзіў чарговы фестываль маладой паэзіі. Цяпер толькі ідуць пісьмы з Грузіі на Украіну, з Украіны—у Беларусь, з Латвіі—у Малдавію, з Эстоніі — у Горкі. Што ў іх? Напэўна, добрая творчая пераліска, трывогі і радасці маладых паэтаў за свой лёс, за лёс свайго народа, за сённяшні дзень. Так і павінна быць.

Я. ЯНІШЧЫЦ,
студэнтка V курса філалагічнага факультэта, дэлегат VI Усесаюзнага фестывалю маладой паэзіі.

● *СПОРТ* ●

КЛАПАЦІЦЦА С Ё Н Н Я

З 7 па 10 снежня ў Гомелі праходзіла адкрытае першынство па класічнай барацьбе. Сюды з'ехаліся прадстаўнікі РСФСР, Ленінграда, Масквы, Украіны, Латвіі, Малдавіі і іншых гарадоў і рэспублік — усяго каля 450 спартсменаў.

Удачна выступілі у гэтым першынстве студэнты нашага універсітэта. Алег Александровіч (2 курс біяфака) у вагавой катэгорыі да 90 кг стаў чэмпіёнам рэспублікі, выканаўшы нарматыў майстра спорту СССР. Уладзімір Фралоў (5 курс юрфака) у вагавой катэгорыі да 100 кг заняў другое месца.

Трэнер зборнай каманды універсітэта ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В. М. Фефелаў задаволен поспехам сваіх выхаванцаў. Пры гэтым ён адзначае, што для таго, каб нашы спартсмены удачна выступалі на усесаюзнай і міжнароднай арэне ў будучым, трэба стварыць належныя ўмовы для трэніровак. Перш за усё неабходна спецыялізаваная зала для барацьбы, якая б адпавядала сучасным патрабаванням.

● ВЯРНУЛІСЯ З ТРАФЕЯМІ

З 4 па 6 снежня у Калінінградзе праходзіў турнір па баскетболу паміж камандамі Ленінградскага, Калінінградскага і Беларускага універсітэтаў. Ініцыятарам гэтых спаборніцтваў з'явіўся спартыўны клуб Калінінградскага універсітэта.

Удачна выступіла наша жаночая каманда. Яна заняла I месца і заваявала пераходны прыз. Мужчынская каманда не змагла выехаць у поўным саставе. Але тым не менш нашы рабяты заваявалі сімпатыі балельшчыкаў сваёй працавітасцю і воляй да перамогі.

Яшчэ два прызы прывезлі нашы баскетбалісты. Капітан жаночай каманды Людміла Жабінская (IV курс геафака) і капітан мужчынскай каманды Аляксандр Малышаў (V курс фізфака) былі прызнаны лепшымі ігракамі турніру. Ім уручаны прызы.

В. ЯКАНЕН.

ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ!

Наступны нумар нашай газеты будзе прысвечан Новаму году. Каб ён быў па-сапраўднаму святочным і цікавым, патрэбна ваша дапамога.

Прыносьце, калі ласка, у рэдакцыю святочныя замалёўкі аб таварышах, расказы, гумарэскі, фельетоны, вершы, малюнкі і фотаздымкі.

Паспяшайцеся! Апошні тэрмін здачы матэрыялаў — наступны чацвер. Чакаем вашых твораў.

РЭДКАЛЕГІЯ.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

НА ГАЗЕТУ СА АН СССР «ЗА НАУКУ В СИБИРИ» НА 1971 ГОД

Газета сібірскага аддзялення Акадэміі навук СССР «За науку в Сибири»— адзіная ў нашай краіне газета для навуковых работнікаў усіх асноўных спецыяльнасцей.

У газету пішуць вучоныя буйнейшых даследчых цэнтраў, акадэмічных інстытутаў Заходняй і Усходняй Сібіры, Далёкага Усходу і Крайняй Поўначы, а таксама супрацоўнікі галіновых і праектных інстытутаў, КБ і вышэйшых навучальных устаноў нашай краіны.

Газета выходзіць у свет адзін раз у тыдзень на васьмі палосах.

Падпісацца на газету можна ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку. Індывідуальныя падпісчыкі могуць перавесці падпісную плату па пошце на спецрахунак ОУПЭС СО АН СССР 14128 у Савецкім аддзяленні Дзяржбанка г. Новасібірска і паведаміць аб гэтым у рэдакцыю (г. Новасібірск, вул. Церашковай, 30, п. 221) з указаннем дакладнага адраса і нумара квітанцыі.

Падпісная цана на год—2 рублі. Падпіска на паўгода і менш не прымаецца.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2000 экз. Зак. 1634. АТ 09572.